тармозіць станаўленне яе суверэнітэту. Літаратура як сродак развіцця і сцвярджэння нацыянальнай самасвядомасці знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Ці знойдуцца сілы ў нашага народа выратаваць культуру, захаваць і ўмацаваць суверэнітэт сваёй дзяржавы? Адказ на гэтае пытанне, відаць, зможа даць толькі час.

УДК 947. 6

В.С.Лявоненка, ст. выкладчык

## РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАГА ЎЗРОЎНЮ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ Ў 70-х - ПЕРШАЙ ПАЛ. 80-х гг. ХХ ст.

На пачатку 70-х гадоў вырашэнне задачы пераводу эканомікі рэспублікі на рэйкі інтэнсіфікацыі партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР разглядала не толькі з пункту гледжання паскарэння развіцця тэхнічнага прагрэсу, але і істотнага павышэння ўзроўню агульнай і прафесійнай адукацыі насельніцтва. Лічылася неабходным паслядоўна павышаць узровень адукацыі і кваліфікацыі працоўных, завяршыць пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі, здзейсніць неабходныя меры па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і рабочых і перападрыхтоўцы кадраў у сувязі з укараненнем новай тэхнікі і паляпшэннем арганізацыі вытворчасці.

Актуальнасць дадзенай праблемы выклікалася і тым, што амаль 30 % рабочых мелі пачатковую адукацыю.

На працягу 70-х гадоў кіраўніцтвам краіны і рэспублікі быў прыняты цэлы шэраг пастаноў, накіраваных на пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. У 1971-1975 гг. былі здзейснены мерапрыемствы па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сярэдніх агульнаадукацыйных школ. Праводзілася шырокая праграма будаўніцтва новых школьных будынкаў, прыбудоў, вучэбных кабінетаў і інш. неабходных памяшканняў, аснашчэнне іх неабходным вучэбным абсталяваннем. Карэнная перабудова адбылася ў працоўным навучанні школьнікаў 9-10 класаў. У гэтыя гады пачаўся таксама першы этап пераходу школ на работу па новых праграмах і падручніках, у якіх вызначаліся ідэі развіцця сучаснай навукі, больш поўна выконваўся прынцып політэхнізму ў навучанні і выхаванні моладзі. У праграмах вучэбных прадметаў была павялічана ўдзельная вага лабараторных і практычных заняткаў, працоўнага навучання. У другой палове 70-х гадоў сталі функцыяніраваць вучэбна-вытворчыя камбінаты. Да 1981 г.у БССР быў адкрыты 191 ВВК. У 1985 г.у іх прайшлі працоўнае навучанне 85 % вучняў старэйшых класаў.

Варта адзначыць, што ВВК не змаглі забяспечыць на практыцы ўзаемасувязь працоўнай, політэхнічнай і прафесійнай падрыхтоўкі вучняў. Тым не менш у выніку агульных намаганняў кіраўніцтва рэспублікі, працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый у БССР адбываўся хуткі рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, асабліва моладзі. Калі ў 1965 г.сярэднюю (агульную і спецыяльную) адукацыю атрымалі 50 тыс.чалавек, то ў 1985 г.- каля 170 тыс.чалавек. За 1971-1975 гг.сярэднюю адукацыю набылі 658 тыс.вучняў. Амаль усе выпускнікі 8-х класаў адукацыйнай школы працягвалі вучобу. Ужо ў 1977 г.яны склалі 98,3 % ад агульнай колькасці вучняў, якія скончылі васьмігадовую школу. У дзесятай пяцігодцы ў рэспубліцы быў завершаны пераход ад ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі, што з'явілася значным поспехам у сацыяльна-палітычным жыцці. Новыя праграмы ў поўнай меры паднялі ўзровень адукацыі, наблізілі яе да запатрабаванняў жыцця. Разам з тым аб'ём і складанасць прадугледжанага матэрыялу аказаліся завышанымі, што прыводзіла да перагрузкі вучняў.

Найбольш сур'ёзнымі недахопамі ў рабоце школ былі ідэалагізаванасць і дагматычны характар навучання. Акрамя таго, паступова зніжаліся асігнаванні на адукацыю. Так, у сярэдзіне 60-х гадоў у БССР выдаткі на агульнаадукацыйную школу складалі 6-7 % ад валавога нацыянальнага прадукту, на пачатку 80-х гадоў - 4,2 %, а ў сярэдзіне 80-х - 5,2 %. Паслядоўнае скарачэнне бюджэтных асігнаванняў прыводзіла да непазбежнага адставання ў развіцці вучэбна-матэрыяльнай базы, асабліва ў справе камп'ютэрызацыі.

Рост агульна-адукацыйнага ўзроўню адбываўся таксама праз сістэму прафесійна-тэхнічнага, сярэдняга спецыяльнага і вышэйшага навучання. У 70-х гадах на падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых з сярэдняй адукацыяй перайшлі прафтэхвучылішчы БССР. На пачатак 1986 г.з 240 прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў рэспублікі 226 з'яўляліся сярэднімі. У іх навучалася 95 % агульнай колькасці вучняў прафтэхадукацыі.

Перад сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школамі ў разглядаемы перыяд стаяла задача забеспячэння ўзрастаючай патрэбнасці ў кадрах сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. Колькасць сярэдніх спецыяльных устаноў за 1960-1985 гг.павялічылася са 102 да 139, а навучэнцаў у іх - з 62,6 тыс.да 160,4 тыс. За гэты ж перыяд колькасць ВНУ ўзрасла з 24 да 33. Па большасці спецыяльнасцей вышэйшая і сярэдняя школы поўнасцю забяспечылі патрэбы рэспублікі ў неабходных кадрах спецыялістаў.

Значны крок наперад зрабіла Беларусь і ў культурным развіцці. У 70-х - пачатку 80-х гадоў адбываўся колькасны і якасны рост сеткі культурных

устаноў: бібліятэк, тэатраў, музеяў. Далёка за межамі рэспублікі былі вядомы творы беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў, мастакоў, скульптараў. І ўсё гэта было даступным кожнаму жыхару Беларусі.

Такім чынам, у 70-х- пачатку 80-х гадоў у развіцці адукацыі і культуры былі дасягнуты відавочныя поспехі, адбыліся станоўчыя зрухі. Аднак працэсы запавольвання сацыяльна-эканамічнага развіцця негатыўна адбіліся і на стане адукацыі і культуры. Паступова і тут накопліваліся праблемы і негатыўныя з'явы.

УДК 947.6

В.Е.Козляков, доцент

## К ВОПРОСУ О ЧИСЛЕННОСТИ, СТРУКТУРЕ И НАЦИОНАЛЬНОМ СОСТАВЕ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX-НАЧАЛЕ XX В.

Исследование истории интеллигенции Беларуси требует тщательного изучения динамики изменения ее численности, структуры, национального состава в разные периоды эпохи. Между тем в исторической литературе существует определенная разноголосица по этой проблематике, зачастую называются спорные цифры, не подкрепленные к тому же достаточно убедительным документальным материалом. Попытаемся в какой-то степени восполнить этот пробел.

По итогам первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г. к интеллигенции Беларуси (на основании данных Виленской, Витебской, Гродненской, Минской и Могилевской губерний) можно отнести следующие категории по роду занятий: чиновники администрации, суда и полиции; лица, состоявшие на общественной, сословной и благотворительной службе; занимавшиеся частной юридической практикой, учебной и воспитательной, научной и творческой, врачебной и санитарной деятельностью; духовенство различных религиозных конфессий. Если суммировать данные по этим категориям и исходить из официальной статистики, то численность интеллигенции составила 54663 чел., что соответствовало лишь 0,64% всего населения указанных губерний. Правда, в материалах переписи фигурируют еще данные графы «Вооруженные силы». Если учесть, что в тот момент в этих губерниях состояло на военной службе 118899 чел., а один офицер приходился на 24 солдата, то нетрудно подсчитать, что офицерство здесь насчитывало 4954 чел. Таким образом, к интеллигенции (вместе с офицерами) можно отнести 59617 чел. (0,69% всего населения). Для сравнения приведем данные по всей России: доля интеллигенции составляла 2,7%. Вероятно, более низкий ее процент в бе-